ходнія вобласці БССР, з лістапада 1943 г. дзейнічаў у складзе 1-й Баранавіцкай партызанскай брыгады. Камандзіры атрада — С. Ф. Бубін, А. Ф. Антановіч; камісары — А. І. Сяргушка, К. М. Кірылаў, К. С. Кузняцоў, М. Ц. Цяцерын, С. В. Захарэвіч. У жніўні 1942 г.— жніўні 1943 г. партызаны атрада «Бясстрашны» на чыгуначным участку Полацк — Даўгаўпілс падарвалі і пашкодзілі 29 эшалонаў, у студзені 1943 г. ўдзельнічалі ў разгроме варожага апорнага пункта ў в. Слабада. У лютым — сакавіку 1943 г. вялі баі супраць карнікаў. 8.7.1944 г. ў складзе 1-й Баранавіцкай брыгады атрад «Бясстрашны» (125 партызан) злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

У 1979 г. ў памяць аб баявой дзейнасці партызанскага атрада «Бясстрашны» пастаўлена стэла.

Т. Р. Чуракова.

в. Казімірова, Клясціцкі сельсавет

2104. ПАРК (архіт.). На ўскраіне вёскі. Закладзены ў 2-й палавіне 19 ст. як прысядзібны. Кампазіцыя арганізавана вакол прамавугольнай сажалкі са штучным астраўком. Належыць да лесапаркаў.

в. Канашонкі, Гарбачэўскі сельсавет

2105. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 2 км на поўнач ад вёскі. Пахаваны 25 мірных жыхароў в. Гарэлая Яма, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі 12.2.1943 г. У 1965 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Канюхова, Сакалішчанскі сельсавет

2106. ПОМНІК ПАРТЫЗАНАМ І МІРНЫМ ЖЫХАРАМ (гіст.). За 0,3 км на ўсход ад вёскі, каля шашы Полацк — Юхавічы.

У снежні 1943 г.— студзені 1944 г. нямецка-фашысцкія акупанты праводзілі адну са шматлікіх аперацый па разгрому партызан і масаваму знішчэнню мірных жыхароў, якая ахапіла тэрыторыю паміж Полацкам, Себежам і Дрысай. Абараняючы мірнае насельніцтва, каля 7 тыс. партызан брыгад Асвейскай імя М. В. Фрунзе, 1-й і 2-й Дрысенскіх, Латвійскай, Калінінскіх стрымлівалі націск 25 тыс. знятых з фронту гітлераўскіх войск з танкамі і авіяцыяй. Сілы былі няроўныя, і блакаднае кальцо ўсё больш звужалася. У радыусе 10 км вакол в. Роўнае Поле сканцэнтраваліся партызанскія брыгады, некалькі тысяч мірных жыхароў. 24.12.1943 г. партызаны атрымалі радыёграму Беларускага штаба партызанскага руху аб вывадзе насельніцтва за лінію фронту. На нарадзе падпольных Асвейскага і Дрысенскага райкомаў КП(б)Б і партызанскага камандавання было вырашана ў поч з 27 на 28 снежня прарваць варожую блакаду паміж вёскамі Сакалішча і Клясціцы і вывесці людзей у савецкі тыл. Ударная група беларускіх і латышскіх партызан фарсіравала р. Нішча каля в. Канюхова і ў кароткім жорсткім баі прарвала блакаду амаль на кіламетровым участку. За лінію фронту было выведзена больш як 10 тыс. чалавек.

У 1974 г. на ўшанаванне памяці партызан і мірных жыхароў, якія загінулі ў час прарыву блакады, пастаўлены абеліск.

Літ.: Захаров И. К. Война в краю озер.— 2 изд.— Мн., 1973. *А. І. Марозава.*

в. Карпіна, Краснапольскі сельсавет

2107. ГАРАДЗІШЧА (археал.). Мясцовая назва Гарадок. За 0,5 км на ўсход ад вёскі, на забалочанай мысавасці. Пляцоўка авальная, памерам 40×25 м. Вышыня пагорка 7 м. Даследаваў у 1974 г. Г. В. Штыхаў. Культурны пласт 0,5 м. Знойдзена ляпная кераміка. Адносіцца да днепра-дзвінскай культуры. Матэрыялы даследаванняў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

2108. КУРГАН ПАМЯЦІ (гіст.). У цэнтры вёскі, на тэрыторыі калгаснага саду. Насыпаны ў 1968 г. на ўшанаванне памяці больш як 30 жыхароў вёскі, спаленых нямецка-фашысцкімі акупантамі ў лютым 1943 г.

в. Клясціцы, цэнтр сельсавета

2109. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). У цэнтры вёскі. Пахаваны 60 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1947 г. на магіле пастаўлены абеліск.



2112. *Помнік землякам.*

2110. МАГІЛА ДАВЫДАВА Віктара (гіст.). На могілках. Юны партызан атрада імя М. А. Шчорса В. Давыдаў загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў 14.5.1942 г. У 1949 г. на магіле пастаўлены абеліск.

2111. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА Ў ГОНАР КАМСАМОЛЬСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ (гіст.). 5.4.1943 г. ў вёсцы адбылася міжраённая камсамольская канферэнцыя Асвейскага, Бешанковіцкага, Верхнядзвінскага, Полацкага, Расонскага р-наў. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі камандзіры і камісары партызанскіх брыгад і атрадаў — камсамольцы, усяго 85 чалавек. Канферэнцыя прыняла зварот да ўсіх камсамольцаў і моладзі акупіраваных раёнаў, у якім заклікала да актывізацыі барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У памяць аб канферэнцыі на будынку Клясціцкай сярэдняй школы ў 1969 г. ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Літ.: Лобанок В. Е. В боях за Родину.— 3 изд.— Мн., 1964. *Т. Р. Чуракова.*

2112. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі. На ўшанаванне памяці воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

2113. ПОМНІК У ГОНАР ПЕРАМОГІ РУСКІХ ВОЙСК (гіст.). У цэнтры вёскі.

У Айчынную вайну 1812 г. ў баі 18—20 ліпеня паміж вёскамі Клясціцы і Якубова 17-тысячны рускі корпус пад камандаваннем генерала П. Х. Вітгенштэйна нанёс цяжкае паражэнне 29-тысячнаму французскаму корпусу маршала Н. Ш. Удзіно. Французы страцілі да 10 тыс. забітымі і параненымі. Больш за 3 тыс. салдат праціўніка былі ўзяты ў палон. У баі вызначыўся авангард корпуса пад камандаваннем генерала Я. П. Кульнева. У выніку гэтай перамогі дарога на Пецярбург для французскай арміі была перакрыта.

У 1962 г. да 150-годдзя перамогі рускіх войск пад Клясціцамі пастаўлена стэла. Гл. таксама артыкул № 2161 «Помнік Кульневу Якаву Пятровічу».

Літ.: Бескровный Л. Г. Хрестоматия по русской военной истории.— М., 1947; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года.— Мн., 1962. *Т. Р. Чуракова.*

в. Краснаполле, цэнтр сельсавета

2114. МАГІЛА ПЯЧУГІНА Сямёна Васілевіча (гіст.). На могілках. Партызан атрада імя К. Я. Варашылава Расонскай партызанскай брыгады імя І. В. Сталіна С. В. Пячугін загінуў у